# ЛЯ ВЫТОКАЎ СТАРАЖЫТНАГА АБРАДУ

**У. С. Гарбачэнка**

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік А. С. Дашкевіч

Старажытны абрад – сукупнасць агульнапрынятых сімвалічна-знакавых дзеянняў, якія ў канцэнтраваным выглядзе «адлюстроўваюць лад жыцця народа, духоўныя светаўяўленні, мараль, сацыяльную і этнічную псіхалогію» [1, с. 9]. Большасць старажытных беларускіх абрадаў выяўляюць агульнаславянскія вытокі,

але маюць мноства адметнасцей, уласцівых толькі Беларусі. Так, свята Радаўніца многімі сучаснымі даследчыкамі адносіцца да рэлігійных абрадаў, нягледзячы на тое, што гісторыя яго цесна звязана з язычніцтвам. Зацікаўленасць дадзенай тэмай абумоўлена тым, што вытокі гэтага старажытнага абраду сустракаюцца выключна ў беларусаў. Мэта работы – выявіць адметнасці святкавання старажытнага абраду.

Беларускае свята Радаўніца з'яўляецца адлюстраваннем старажытнага язычніцкага абраду, якое «накладзена» на хрысціянства і прымеркаванага да Вялікадня. Дзіўны і сам абрад, і той факт, што ен больш не сустракаецца ў свеце, акрамя беларусаў. Сам па сабе ен патрабуе дахрысціянскай традыцыі хаваць цела ў звычайнай магіле і прадугледжвае яе наведванне сваякамі памерлага – што з'явілася толькі пры хрысціянстве, а ў язычніцкі час існавала толькі ў Цэнтральнай і Заходняй Беларусі (Літва, яцвягаў, Дайнова) і ў Мазовіі (цяпер Польшча), а таксама ў прусаў. Гэта значыць, у заходніх балтаў. У астатніх народаў Еўразіі існавалі іншыя традыцыі: трупаспаленне і пахаванне ў пячорах з забаронай вяртання да магіл [2].

З сярэдзіны II тыс. да н. э. для большасці народаў (Індыі, Скандынавіі, фіна-ўграў Расіі і праславян Цэнтральнай Еўропы) была распаўсюджана крэмацыя. У гістарычных апісаннях пахавальных абрадаў Цэнтральнай Расіі адзначаецца, што целы сваякоў спальвалі, а косткі «збіралі ў малую пасудзіну і ставілі на слуп на ростанях», у такім выглядзе косткі «чура» (або «шчура», гэта значыць прадзеда) ахоўвалі родзіча ад усякага ліха. Адсюль слова «прашчур» і выраз «Цур мяне!», гэта значыць захоўвай мяне дзед. Крэмацыя была звычайным абрадам для ўсей Цэнтральнай Расіі, што падцвярджаецца ўсімі раскопкамі. Нічога падобнага ў язычніцкай Беларусі не было: памерлых не спальвалі, а хавалі. У Расіі існавала іншая традыцыя як адлюстраванне трупаспалення: ужо ў хрысціянскі час там над могілкамі разводзілі вогнішчы, каб усе ж неяк «прыцягнуць» пахаванага да абраду агню. Хрысціянства забараняла крэмацыю як супярэчнасць вучэнню аб уваскрэсенні з мертвых, таму да 400 года ў Рымскай імперыі крэмацыя спыняецца. Хто не хаваў на царкоўных могілках памерлых, а спальваў іх трупы, караўся смерцю. Крэмацыі не было ў іўдзеяў і мусульман, але і там Радаўніца была абсалютна недапушчальная. Цела павінна было на насілках ставіцца да заходу сонца на могілках (у іўдзеяў – пячора завальваецца каменнямі, у мусульман – яма ў аддаленым ад вескі месцы). Набліжэнне або дакрананне да магілы пахаванага на Ўсходзе разумелася, па законе, як апаганьванне, і патрабавалася спецыяльная цырымонія ачышчэння. Цеплы клімат спрыяў раскладанню трупа і быў прычынай такіх абрадаў.Такім чынам, язычніцкая традыцыя Радаўніцы існавала толькі ў нас на Беларусі, дзе целы памерлых яшчэ ў дахрысціянскія час не спальвалі, а закопвалі. Але навошта ім адносілі ежу і елі з мертвымі? І чаму само свята называецца Радаўніцай?

У энцыклапедычных крыніцах Радаўніца – веснавое язычніцкае свята ўсходніх славян, звязанае з культам продкаў. Тэрмін «усходнія славяне» – тут зусім недарэчны, бо адзначаюць гэтае свята здаўна толькі адны беларусы (этнічна – заходнія балты). І гэтае свята да славян наогул ніякіх адносін не мае. На самой справе ў Расіі гэтае свята з'явілася зусім нядаўна па гістарычных мерках толькі пасля вайны Масковіі з ВКЛ 1654–67 гг., калі цар Аляксей Міхайлавіч знішчыў палову беларусаў, а каля 300 тысяч вывез у якасці рабоў у Масковію [3]. Менавіта ад гэтых паняволеных беларусаў (літвінаў) мясцовыя фінскія народы Масковіі і пераняялі Радаўніцу. Вядомы рускі фалькларыст І. П. Сахараў (1807–1863), які займаўся даследаваннем фальклору Масковіі, Украіны і Літвы-Беларусі, не знайшоў агульных вытокаў старажытнага абраду. З'яўленне свята у Расіі ў XVII–XVIII стст. адзначаецца ў «паданняў рускага народа», дзе гаворыцца, што «літоўцы выходзяць

у аўторак на магілы сваіх бацькоў, у дзве гадзіны папаўдні … спачатку пачынаецца катанне на магілах чырвоных яек, потым абліванне магіл медам і віном … яйкі раздаюцца жабракам … магілы накрываюцца белым абрусам, устанаўліваюцца стравы» [3]. Пад «літоўцамі» І. П. Сахараў у 1836 г. разумеў менавіта цяперашніх беларусаў, а зусім не жыхароў сенняшняй Літвы, якіх з 1870-х гг. царызм паступова пачынае называць «літоўцамі». Самае цікавае ў тым, што Радаўніцу літоўцы не адзначаюць. Як не адзначаюць і славяне (акрамя літвінаў-беларусаў і мазураў ў Польшчы – але гэта заходнія балты, а не славяне). Патроху гэта свята ўвайшло ў побыт ляхаў і ўкраінцаў, якія жылі побач у Паўночнай Украіне, а з XVII ст. з'яўляюцца ад палонных літвінаў-беларусаў спачатку ў самой Маскве, а затым праз стагоддзе – у акрузе.

Вельмі цікавым з'яўляецца паходжанне і самой назвы гэтага свята. У беларусаў Цэнтральнай і Заходняй Беларусі, заходніх балтаў – літвінаў, святой вобласцю ў язычніцкай рэлігіі з'яўлялася тэрыторыя на поўнач ад Ліды, гэта значыць на рацэ Радунь (цяпер Радунька), што цякла ў княстве Дайнова (сталіца Ліда), і да ракі Вілія. Менавіта ў гэтым месцы ВКЛ у нашых продкаў лічыўся «цэнтр збору памерлых душ», там было засяроджванне ўсяго магічнага і ўпакойнага, мясціна багоў. Дарэчы, недалека ад Радуні, на Віліі, таксама святым месцы, нашы продкі і заснавалі Вільню. Цалкам магчыма, што свята Радаўніца мае свае імя ад гэтай ракі, свяшчэннай для нашых продкаў. Ва ўсякім выпадку, менавіта туды чамусьці везлі хаваць князеў ВКЛ як у месца іх апошняга заспакаення. Там было святое месца для пахаванняў нашай шляхты, пра што сведчаць летапісы. На месцы гэтых старажытных пахаванняў паўстаў і старажытны горад – Радунь, дзе праводзіліся пахавальныя абрады нашых князеў. Цяпер гэта толькі беларускі гарадскі паселак на рацэ Радунька (былой Радуні), паміж Вільняй і Лідай, дзе сення жыве каля трох тысяч жыхароў. Аднак ен – старажытны горад, упершыню згадваецца ў 1387 г. ў грамаце Ягайлы як цэнтр воласці. У XIV–XVII стст. там будуецца магутны замак, у 1649 г. атрымлівае Магдэбургскае права, мае свой герб. З 1958 г. зведзены да статусу гарадскога паселка.

Такім чынам, абрад памінання памерлых, свята Радаўніца і культавая язычніцкая тэрыторыя Радунь – гэта сувязь гістарычных рэалій, версія, якая дазваляе растлумачыць назву свята імем святога пахавальнага месца ў нашых язычніцкіх продкаў Цэнтральнай і Заходняй Беларусі.

Літаратура

1. Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В. С. Цітова ; маст. І. І. Бокі, У. М. Жук. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с.
2. Рэжым доступу: http://kurier.me/ru/page/dates/728.
3. Рэжым доступу: http://www.remezovi.ru/blog/2009/04/30/radunica/.